**ЗЛУЧНІК,** лексіка-граматычны клас слоў, якія афармляюць сувязь паміж словаформамі ў саставе простага сказа, паміж часткамі складанага сказа, а таксама ўнутрытэкставыя сувязі ў межах складанага сінтаксічнага цэлага. Паводле марфемнай структуры З. бываюць невытворнымі, якія не падзяляюцца на марфемы і не суадносяцца са знамянальнымі часцінамі мовы («а», «ці», «каб»), і вытворнымі (словаўтваральна звязаны са знамянальнымі часцінамі мовы). Сярод вытворных З. адрозніваюць простыя («нібыта», «калі», «таму») і складаныя («з-за таго што», «тады як», «для таго каб»). У залежнасці ад спосабу выкарыстання З. дзеляцца на адзіночныя, паўторныя («і ... і», «або ... або», «ці ... ці») і парныя («не столькі ... колькі», «калі ... то», «не толькі ... але і»). Па функцыянальным значэнні прнята размяжоўваць два асноўныя класы З., да якіх адносяцца спалучальныя («і», «ды», «таксама»), супраціўныя («а», «аднак», «затое»), размеркавальныя («ці ... ці», «то ... то», «або ... або»), а таксама З. падпарадкавальныя − прычыны («таму што», «бо», «з прычыны таго што»), часу («калі», «пакуль», «як толькі»), выніку («так што», «у выніку чаго», «дык»), уступкі («хаця», «нягледзячы на», «няхай») і інш.

*Літ*.: Граматыка беларускай мовы. Т. 1: Марфалогія. Мн., 1962; Кароткая граматыка беларускай мовы. Ч. 1: Фаналогія. Марфалогія. Марфаналогія. Мн., 2007; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987.

*Д.В.Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ